# Грунтоўная вандроўка ў мінулае

**Значная з'ява ў беларускай гістарычнай навуцы – менавіта так можна сказаць пра 6-томнае выданне «Гісторыя Беларусі», апошняя кніга якога ўбачыла свет у 2011 годзе. Высокакваліфікаваны шматлікі навуковы калектыў – дзясяткі дактароў і кандыдатаў гістарычных навук – працаваў над падрыхтоўкай гэтага вялікага збору, кнігі якога выходзілі на працягу апошняга дзесяцігоддзя. Пачатак напружанай і шматгадовай працы быў пакладзены праектам Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь.**

Шасцітомная «Гісторыя Беларусі» выдадзена на падставе і ў адпаведнасці з нацыянальна-дзяржаўнай канцэпцыяй гісторыі беларускага народа, які і з'яўляецца галоўным аб'ектам і суб'ектам гэтага гістарычнага даследавання. Выданне працягвае тэму, распачатую яшчэ ў «Нарысах гісторыі Беларусі», першая і другая часткі якіх выйшлі адпаведна ў 1994 і 1995 гадах тыражом па 40 тыс. экзэмпляраў кожная. Толькі ў шасцітомніку дадзена значна пашыранае і сістэмнае адлюстраванне мінулага Беларусі.

Галоўны рэдактар выдання – акадэмік НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар М. Касцюк. Намеснікі рэдактара – дактары гістарычных навук, прафесары М. Біч і У. Навіцкі. У складзе галоўнай рэдкалегіі дактары гістарычных навук Ю. Бохан, Г. Галенчанка, Г. Штыхаў, кандыдаты гістарычных навук П. Лойка, М. Чарняўскі, В. Яноўская.

Галоўнай мэтай навуковага калектыву, які працаваў над шасцітомнікам, было паказаць гістарычны шлях беларускага народа са старажытных часоў да нашых дзён. Шлях, які вызначаўся складанасцю і многімі падзеямі як стваральнага, так і разбуральнага характару. Шлях, што бярэ пачатак ад з'яўлення першабытных супольнасцей людзей на тэрыторыі Беларусі, працэсу яе засялення і славянізацыі балтаў, фарміравання ўсходнеславянскіх саюзаў плямён: крывічоў-палачан, дрыгавічоў, радзімічаў. Праз вытокі беларускай гісторыі і ў першых дзяржаўных утварэннях – Полацкім, Турава-Пінскім, Навагародскім, Ваўкавыскім, іншых княствах, Берасцейскай і другіх землях. Гэта пераканаўча паказана ў першым томе «Старажытная Беларусь (Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст.)», выдадзенага ў 2000 годзе. У кнізе адлюстравана, як у першабытную эпоху і ранняе сярэднявечча насельніцтва беларускіх зямель паспяхова развівала тагачасныя вытворчыя сілы, сацыяльныя адносіны, грамадскі лад, матэрыяльную і духоўную культуру. Распаўсюджанне з канца X – пачатку XI стагоддзя хрысціянства і паступовая замена ім язычніцкіх вераванняў садзейнічалі развіццю грамадства. Захоўванне на працягу значнага часу пэўнага двоеверства закладвала асновы верацярпімасці ў асяроддзі мясцовых жыхароў, што затым праяўлялася і адносна прадстаўнікоў іншых рэлігій.




Другі том «Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага», што ўбачыў свет у 2008 годзе, пачынаецца з не менш значных гістарычных падзей – утварэння ў сярэдзіне XIII стагоддзя Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Дзякуючы гэтай магутнай сярэдневяковай еўрапейскай дзяржаве гісторыя беларускага народа выйшла на новы ўзровень. У поліэтнічным дзяржаўным утварэнні беларускія землі адыгрывалі вызначальную ролю ў эканамічным, палітычным, культурным жыцці. Адбывалася станаўленне і ўдасканаленне інстытутаў саслоўна-прадстаўнічай манархіі.

Значнае месца ў томе адведзена развіццю беларускага этнасу, калі яго тагачасная мова на працягу стагоддзяў была дзяржаўнай, пачыналася і шырылася кнігадрукаванне, развівалася манументальнае і дэкаратыўнае мастацтва, набіралі моц мясцовыя традыцыі. Асабліва гэта было характэрна для XVI стагоддзя. Грунтоўна адлюстраваны рэлігійныя вераванні. Вялікае Княства Літоўскае падавала прыклад і ў асновах талерантных адносін паміж праваслаўнымі і каталікамі, прадстаўнікамі іншых канфесій. Пераканаўча



















паказана распаўсюджванне на беларускіх землях еўрапейскіх ідэй Адраджэння, Рэнесансу, Асветніцтва. На гады найвышэйшага росквіту ВКЛ, калі Княства з'яўлялася перадавой дзяржавай, а народ лічыўся адным з найбольш развітых у Еўропе, прыпадае наданне гарадам магдэбургскага права. Прыведзеныя факты яскрава характарызуюць нашу сярэдневяковую гісторыю.

У кнізе чытач знойдзе шмат цікавай інфармацыі пра эканамічнае, сацыяльна-палітычнае, культурнае развіццё, узмацненне ваеннай магутнасці ВКЛ. Апошняе, дарэчы, было крайне неабходна на фоне суперніцтва з рускімі княствамі за права аб'яднання ўсходнеславянскіх зямель, супрацьборства мангола-татарам. Усё гэта патрабавала значных людскіх і матэрыяльных рэсурсаў. Аднак найбольшай пагрозай беларускім землям, як і ўсяму Вялікаму Княству Літоўскаму на ранніх этапах яго існавання, былі перыядычныя ўварванні захопнікаў з захаду – крыжакоў. Звычайна вынікам такіх паходаў былі велізарныя людскія страты, спусташэнні, матэрыяльны ўрон.

Эпахальнай ваенна-стратэгічнай падзеяй сталася Грунвальдская бітва 1410 года. Перамога аб'яднаных сіл ВКЛ, Польскай дзяржавы, некаторых рускіх княстваў была надзвычай пераканаўчая. Больш як на паўтысячу гадоў, аж да Першай сусветнай вайны, не паўтарылася ў значных памерах нямецкая агрэсія на ўсход. Гэта – беспрэцэдэнтны факт у гісторыі чалавецтва. Таму адзначанае 600-годдзе бітвы пад Грунвальдам абавязвае нас аддаць ёй належнае ў гісторыі беларускага, польскага, літоўскага, рускага, украінскага, іншых народаў, ушанаваць подзвіг нашых гераічных продкаў.



Адпаведныя раздзелы кнігі раскрываюць, як у XV і асабліва ў XVI стагоддзях нарастала супрацьстаянне Вялікага Княства Літоўскага і Маскоўскай дзяржавы. Войны, што ўспыхвалі паміж імі, хоць і праходзілі з пераменным вынікам, закранalі, у першую чаргу, беларускія землі, якім наносіліся вялікія страты. Замірэнні пасля ваенных дзеянняў чаргаваліся з новым абвастрэннем адносін. У гэтыя канфлікты ўцягваліся і суседнія народы.

У трэцім томе «Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII стст.)», выдадзеным у 2004 годзе, разглядаецца перыяд – вымушаны ў ходзе Лівонскай вайны саюз Вялікага Княства Літоўскага з Польскай дзяржавай і ўтварэнне Рэчы Паспалітай, які стаў пачаткам найбольш складаных часоў у гісторыі беларускага народа. Палітыка паланізацыі хоць і не змагла дасягнуць сваёй мэты, але яе негатыўнае ўздзеянне на беларускі этнас было відавочным. Найбольш падатлівымі ў гэтых адносінах аказаліся некаторыя магнаты, а таксама частка сярэдняй і дробнай шляхты. Што да шырокіх пластоў сялянства, то яно было больш устойлівае да палітыкі паланізацыі і ў асноўным захавала свае этнічныя каштоўнасці – мову, народную культуру, традыцыі, звычаі.

Шмат месца ў кнізе займае паказ падзей, калі беларускі народ моцна цярпеў ад ваенных дзеянняў. Найбольш трагічнай для яго сталася 13-гадовая вайна паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскай дзяржавай, што адбылася ў 1654–1667 гадах. Тады на землях Беларусі загінула больш за палову насельніцтва. Да вялікіх чалавечых ахвяр і матэрыяльных страт на беларускіх тэры-

торыях прывяла і Паўночная вайна паміж Швецыяй і Расіяй.

У чацвёртым томе «Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.)», што ўбачыў свет у 2005 годзе, адлюстравана гісторыя беларускага народа пасля ўключэння ў канцы XVIII стагоддзя беларускіх зямель у Расійскую імперыю ў выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай. Наступленне на беларускі этнас працягвалася, толькі цяпер з боку рускага царызму. Палітыка русіфікацыі закранула практычна ўсе пласты беларускага насельніцтва. У першую чаргу гэта было характэрна для гарадоў. Царскія ўлады найперш садзейнічалі інтэнсіўнаму развіццю Мінска, каб зрабіць яго процівагай этнаграфічнай беларускай сталіцы – Вільні.

Аўтары паказалі, што ва ўмовах станаўлення на індустрыяльны шлях развіцця назіралася некаторая эвалюцыя этнічных асаблівасцей беларусаў. Адметнай вяхой у апошнія дзесяцігоддзі XIX – пачатку XX стагоддзя з'явіўся рух па шляху станаўлення беларускай нацыі. Яе колькасны рост, асаблівасці эканамічнага і сацыяльнага жыцця, развіццё культуры, захаванне ў сваёй аснове этнічных характарыстык былі тымі фактарамі, якія дазволілі гаварыць аб гэтай прынцыповай з'яве ў гісторыі Беларусі.

Заканамерны паказ у кнізе таго, што ў пачатку XX стагоддзя найбольш грамадска актыўныя беларускія дзеячы стварылі першую нацыянальную палітычную партыю – Беларускую сацыялістычную грамаду. Яе дзейнасць падводзіла да ўсведамлення права беларускай нацыі на дзяржаўнае самавызначэнне. Гэта дапаўнялася культурна-асветнай працай і грамадзянскай пазіцыяй тых дзеячаў, якія групаваліся вакол газеты «Наша ніва». Паказаны складанасці гісторыі беларускага народа ў гады Першай сусветнай вайны, а таксама тое, што пэўным чынам становішча пачало паляпшацца пасля падзення ў Расіі манархічнага рэжыму ў выніку Лютаўскай рэвалюцыі. Рост нацыянальна-дэмакратычнага руху, актывізацыя дзейнасці беларускіх партый садзейнічалі таму, што ўсё больш настойліва ўздымалася пытанне аб самавызначэнні беларускага народа.

Выдадзены ў 2006 годзе пяты том «Беларусь у 1917–1945 гадах» пачынаецца з падзей перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі ў




цэнтры, а затым і на месцах, у тым ліку ў Беларусі. Аб'яўленне бальшавікамі права нацый на самавызначэнне аж да аддзялення і ўтварэння самастойных дзяржаў выклікала адпаведныя спадзяванні. Аднак разгон найбольш прадстаўнічага форуму беларускага народа – Першага Усебеларускага кангрэса, а затым Усерасійскага Устаноўчага сходу выклікалі сумненні ў намерах кіраўнікоў бальшавіцкай партыі і савецкай дзяржавы рэалізаваць заяўленую праграму дэмакратычнага развіцця.

У кнізе пераканаўча раскрыта, што аб'яўленне Беларускай Народнай Рэспублікі, а затым і ўтварэнне Беларускай ССР сталі важнымі вехамі на шляху самавызначэння беларускага народа. БССР, з'яўляючыся своеасаблівай формай беларускай дзяржаўнасці, дзе асноўная роля ў выпрацоўцы бальшавіцкай палітыкі і ажыццяўленні кіравання савецкім грамадствам належала цэнтральным партыйным і дзяржаўным органам, была, тым не менш, значным крокам наперад у параўнанні з Паўночна-Заходнім краем Расійскай імперыі.

Аўтары прыходзяць да высновы, што гісторыя беларускага народа ў савецкі перыяд з'явілася працягам яе ранейшых этапаў. Яна ўвабрала ў сябе і самаадданую працу, і цяжкія выпрабаванні, і калізіі з дзяржаўным будаўніцтвам. Рашэнне аб утварэнні Літоўска-Беларускай ССР і перадачы ўсходнебеларускіх тэрыторый у склад РСФСР, якое было прынята ў Маскве пасля аб'яўлення БССР, характарызавала адносіны бальшавіцкага кіраўніцтва да праблемы самавызначэння і дзяржаўнасці беларускага народа. Аднак вяртанне ў сярэдзіне 20-х гадоў гэтых зямель Беларускай ССР засведчыла даволі рацыянальны падыход у савецкім дзяржаўным будаўніцтве таго часу.

У тэкстах адзначана: калі новая эканамічная палітыка, нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва, індустрыялізацыя, развіццё культуры, уключаючы беларусізацыю, станоўча ўспрымаліся большасцю жыхароў Беларусі, то пераважна адміністрацыйна-камандныя метады правядзення суцэльнай калектывізацыі, як і сама гэтая з'ява, многімі жыхарамі Беларусі фактычна ўспрымаліся адмоўна. Гэта ў першую чаргу адносілася да палітыкі раскулачвання – першай хвалі масавых палітычных рэпрэсій. Паказана, што

наступныя хвалі, асабліва 1937–1938 гадоў, пашырыліся на ўсё грамадства.

Аб'яднанне беларускага народа, як і ўкраінскага, у 1939 годзе, ва ўмовах распачатай Другой сусветнай вайны, было аднаўленнем гістарычнай справядлівасці. Любая вайна, тым больш сусветная, вялікая трагедыя і выпрабаванне. Цяжка нават дакладна падлічыць усе людскія і матэрыяльныя страты, панесеныя Беларуссю ў ходзе Вялікай Айчыннай вайны. Ваеннае мінулае – адна з найбольш трагічных старонак нашай гісторыі. Самаадданае змаганне беларускага народа з нямецка-фашысцкімі захопнікамі таксама стала працягам яго гераічнага мінулага. Але такая з'ява, як калабарацыянізм, засведчыла аб складанасці грамадскага развіцця і неадназначным стаўленні часткі насельніцтва Беларусі да палітыкі і практычнай дзейнасці савецкай улады.

У кнізе адлюстравана, што больш як 30-гадовае сталінскае праўленне ў гісторыі беларускага народа – складаная і неадназначная грамадска-палітычная з'ява. Дасягненні тут былі відавочныя, але здабываліся яны надзвычай вялікім коштам і сумяшчаліся з цяжкімі выпрабаваннямі. Аб'яўленая ў першыя гады савецкай улады мэта – пабудова сацыялістычнага і камуністычнага грамадства ў сваёй краіне, а затым у сусветным маштабе – уяўлялася недастаткова акрэсленай і выразнай. Манапольнае праўленне бальшавіцкай партыі, надзвычай высокая цэнтралізацыя дзяржаўнай улады прывялі да ператварэння адміністрацыйна-каманднай савецкай сістэмы ў таталітарную. Адна з важнейшых яе характарыстык – жорсткія метады ў правядзенні партыйна-дзяржаўнай палітыкі, калі асоба савецкага чалавека стаяла фактычна на апошнім месцы, а на першым была камуністычная ідэя, якой падпарадкоўвалася ўсё – ад людскіх рэсурсаў да матэрыяльных сродкаў і чалавечых каштоўнасцей.

Разглядам аднаўленчага працэсу ў Беларускай ССР, з яго складанасцямі і вынікамі, працягваецца «Гісторыя Беларусі» ў заключным, шостым томе «Беларусь у 1946–2009 гадах» (2011). Чытачы даведаюцца пра факты, якія раней замоўчваліся. Сярод іх антысавецкае падполле, якое дзейнічала ў Заходняй Беларусі амаль да сярэдзіны 1950-х гадоў, матэрыяльная падтрымка насельніцтва БССР Адміністрацыяй дапамогі і аднаўлення Аб'яднаных нацый (ЮНРРА), створанай у 1943 годзе пры ААН, і іншае.




Істотнай высновай з'яўляецца палажэнне аб тым, што пасляваеннае аднаўленне гаспадарчага комплексу адбывалася за кошт жорсткай падатковай сістэмы, якая вялікім цяжарам клалася на сялян і многім была не пад сілу. У 1952 годзе, напрыклад, у 92 тыс. сялянскіх гаспадарак, якія не разлічыліся з дзяржавай, была апісана маёмасць, 50 тыс. прыцягнуты да судовай адказнасці. Вераснёўскі 1953 года пленум ЦК КПСС прыняў шэраг мер па ўстанаўленні больш раўнапраўных адносін паміж дзяржавай і калгасамі, што садзейнічала паляпшэнню вынікаў у сельскагаспадарчай вытворчасці.

На наш погляд, аўтарам удалося раскрыць складанасці і супярэчнасці палітычнай «адлігі», што праходзіла ва ўмовах выкрыцця сталінізму М. Хрушчовым, які на закрытым пасяджэнні XX з'езда КПСС выступаў з дакладам «Аб культе асобы і яго выніках». Развенчванню сталінізму садзейнічалі рэабілітацыйныя працэсы. Спецыфіка іх ажыццяўлення ў БССР усебакова адлюстравана ў кнізе.

Аўтары адзначаюць, што непрадуманая задача ў кароткія тэрміны пабудаваць у асноўным матэрыяльна-тэхнічную базу камунізму, бясконцыя рэфарматарскія памкненні ўскладнялі жыццё краіны, у тым ліку Беларускай ССР. З абраннем кіраўніком партыі і дзяржавы Л. Брэжнева адбылася змена праграмных вехаў КПСС. Разгорнутае будаўніцтва камунізму было заменена канцэпцыяй «развітога сацыялізму», што грунтоўна адлюстравана ў томе. На багатым фактычным матэрыяле раскрываюцца асаблівасці фарміравання новай супольнасці людзей – савецкага народа. Адзначана ігнараванне нацыянальных асаблівасцей насельніцтва саюзных рэспублік. У разглядаемы перыяд духоўнае жыццё грамадства вызначалася павольным, але непазбежным ростам пратэсту. Найбольш радыкальным, хоць і найменш масавым выяўленнем нязгоды і пратэсту, з'явіўся дысідэнцкі рух.

Пераважна на новым матэрыяле паказаны станоўчыя зрухі і нават поспехі ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, сацыяльнай сферы. Разам з тым адзначаецца і нарастанне нявырашаных праб-

лем, якія запавольвалі тэмпы развіцця эканомікі. Штогод 5–7 % прадпрыемстваў і аб'яднанняў не выконвалі планы рэалізацыі прадукцыі, амаль кожнае шостае парушала працоўную дысцыпліну. За кошт навукова-тэхнічных мерапрыемстваў забяспечвалася толькі 50 % прыросту прадукцыйнасці працы.

З абраннем у сакавіку 1985 года кіраўніком партыі і дзяржавы М. Гарбачова пачаліся перамены. У главе «Беларускае грамадства ў часы перабудовы» разглядаюцца формы надання дынамізму эканоміцы. Але фарміраванне новай мадэлі эканамічнага развіцця ў краіне, у тым ліку ў БССР, праходзіла з цяжкасцямі. Галоўная прычына – адсутнасць многіх законаў, а прынятыя нарматыўныя акты ігнараваліся каманднa-адміністрацыйнай сістэмай.

Грунтоўна раскрываецца рэфармаванне палітычнай сістэмы. Паказана, як перабудовачныя працэсы прывялі да змены выбарчых працэдур і заканадаўства аб выбарах, да пашырэння галоснасці, вяртання да шматпартыйнасці і інш. Вынікам гэтага і геапалітычных змяненняў у Еўропе і ва ўсім свеце стаў распад СССР, утварэнне на яго прасторах незалежных дзяржаў, у тым ліку Рэспублікі Беларусь.




Паказам развіцця Беларусі ва ўмовах дзяржаўнага суверэнітэту завяршаецца том. Адлюстравана станаўленне Беларусі на шлях парламентарызму, абранне першым Прэзідэнтам суверэннай дзяржавы А. Лукашэнкі, умацаванне прэзідэнцкай формы кіравання.

З пачатку 1990-х гадоў Беларусь атрымала магчымасць праводзіць самастойную знешнюю палітыку з улікам уласных нацыянальна-дзяржаўных інтарэсаў. Па стану на 1999 год рэспубліку прызналі 137 дзяржаў свету, 124 з іх устанавілі з ёю дыпламатычныя адносіны. Цікавасць у чытача выклікае разгляд пытанняў пра аднаўленне і развіццё супрацоўніцтва паміж суверэннай Беларуссю і Расіяй, іншымі постсавецкімі і заходнімі дзяржавамі, міжнароднымі арганізацыямі.

Рэцэнзуемае выданне «Гісторыя Беларусі» – значнае дасягненне беларускай гістарычнай навукі. Шасцітомнік мае ўсе падставы разлічваць на доўгае жыццё.

**Мікалай ЗАБАЎСКІ,**
**доктар гістарычных навук, прафесар**
**Анатоль ЛЮТЫ,**
**доктар гістарычных навук, прафесар**
**Мікалай САКАЛОЎ,**
**доктар гістарычных навук, прафесар**

## К СВЕДЕНИЮ АВТОРОВ

Требования к оформлению научных публикаций составлены в соответствии с главой 5 Инструкции по оформлению диссертации, автореферата и публикаций по теме диссертации, утвержденной постановлением президиума Высшего аттестационного комитета Республики Беларусь от 24.12.1997 года № 178 (в редакции постановления Высшей аттестационной комиссии Республики Беларусь от 22.02.2006 года № 2).

### Условия приема авторских материалов в журнал «Беларуская думка»

1. Принимаются рукописи, ранее не публиковавшиеся.
2. Редакция принимает рукописи в двух экземплярах (не ксерокопия), напечатанные шрифтом Times New Roman, 14-й кегль, межстрочный интервал – полуторный, объем статьи – до 10 страниц.
3. Статья должна содержать:
• индекс УДК;
• фамилию, имя, отчество автора (авторов), название статьи на русском и английском языках;
• резюме объемом 400–450 знаков на русском или английском языках;
• введение (с поставленными задачами), основную часть, заключение (с четко сформулированными выводами);
• список цитированных источников, оформленный в соответствии с требованиями ВАК Республики Беларусь.
4. Материал визируется автором.
5. Наличие электронного варианта статьи (дискета, компакт-диск, флеш-носитель).
6. Иллюстративный материал предоставляется отдельными графическими файлами.
7. Данные об авторе (0,5–1 страница): телефон, адрес электронной почты, место работы, должность, ученая степень, звание, сфера научных интересов.
8. Рецензия (внешняя или внутренняя).

Материалы, в которых не соблюдены перечисленные условия, не принимаются к рассмотрению редакцией. Рукописи не рецензируются и не возвращаются.

Редакция оставляет за собой право осуществлять отбор, дополнительное рецензирование и редактирование статей.